УТВЕРЖДЕНО
Решение
Наровлянского районного
исполнительного комитета
№

# УСТАВ
Государственного учреждения образования
«Вербовичская базовая школа»

# СТАТУТ
дзяржаўнай установы адукацыі
«Вербавіцкая базавая школа»

аг. Вербавічы, 2022

# Раздзел I
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Вербавіцкая базавая школа» (далей - Установа) зарэгістравана ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў 1 верасня 2015 года за № 490704102.

1.2. Статут Установы зацвярджаецца ў сувязі з прывядзеннем яго нормаў у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

1.3. Поўная назва:

на беларускай мове – Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Вербавіцкая базавая школа»;

на рускай мове – Государственное учреждение образования «Вербовичская базовая школа».

Скарочаная назва:

на беларускай мове – Вербавіцкая базавая школа;

на рускай мове – Вербовичская базовая школа.

1.4. Месца знаходжання Установы: Гомельская вобласць, Нараўлянскі раён, 247810, аграгарадок Вербавічы, вуліца Садовая, 5.

1.5. У адпаведнасці з рэалізуемымі адукацыйнымі праграмамі і праграмамі выхавання Установа адносіцца да тыпу «ўстанова агульнай сярэдняй адукацыі» і віду «базавая школа», мае пячатку з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, штамп са сваім найменнем, разліковы рахунак у банку Рэспублікі Беларусь.

1.6. Установа з’яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй, якая фінансуецца з бюджэту Нараўлянскага раёна.

1.7. Установа з’яўляецца юрыдычнай асобай у арганізацыйна – прававой форме ўстановы, мае ў аператыўным кіраванні адасобленную частку дзяржаўнай уласнасці, нясе самастойна адказнасць па сваіх абавязках, можа ад свайго імя набываць і ажыццяўляць маемасныя і немаемасныя правы, выконваць абавязкі, быць істцом і адказчыкам у судзе, адкрываць разліковы і іншыя рахункі ў банках і нябанкаўскіх крэдтна-фінансавых арганізацыях, мець пячатку, штампы, фірменныя бланкі сасваім найменнем і іншымі рэквізітамі.

1.8. Установа з’яўляецца дзяржаўнай установай адукацыі, у якой рэалізуецца адукацыйная праграма дашкольнай адукацыі для выхаванцаў дашкольнага ўзросту, ажыцяўляецца навучанне і выхаванне на I і II ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, рэалізуецца праграма выхавання і аховы праў і законных інтарэсаў дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, а таксама могуць рэалізоўвацца адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі.

1.9. У сваей дзейнасці Установа кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і іншым заканадаўствам.

1.10. Установа самастойна плануе сваю дзейнасць і вызначае перспектывы развіцця, зыходзячы з інтарэсаў, мэт, задач Установы і Заснавальніка.

## Раздзел II
## ПРАДМЕТ, МЭТЫ І ЗАДАЧЫ ДЗЕЙНАСЦІ ЎСТАНОВЫ

2.1. Прадметам дзейнасці Установы з’яўляецца ажыццяўленне ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь адукацыйнай дзейнасці, якая ўключае ў сябе арганізацыю і правядзенне вучэбнай, выхаваўчай і метадычнай работы.

2.2. Асноўнай мэтай дзейнасці Установы з’яўляецца рэалізацыя адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, праграмы выхавання і аховы законных інтарэсаў дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі, дзяржаўных адукацыйных стандартаў агульнай сярэдняй адукацыі, фарміраванне адукаванай, сацыяльна, духоўна і маральна зрэлай, творчай асобы, выхаванне грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, павага правоў і свабод чалавека, любові да Радзімы, сям’і, прывіццё навыкаў здаровага ладу жыцця.

2.3. Для дасягнення мэт дзейнасці Установа рэалізуе наступныя задачы:

развіццё асобы дзіцяці ранняга і дашкольнага ўзросту у адпаведнасці з яго ўзроставымі і індывідуальнымі асаблівасцямі, здольнасцямі і запатрабаваннямі, фарміраванне ў яго маральных норм, набыццё ім сацыяльнага вопыта;

забеспячэнне атрымання вучнямі агульнай базавай адукацыі, а таксама неабходных для выбару ў дальнейшым прафесіі, першасных ведаў і навыкаў;

падрыхтоўка вучняў да паступлення ва ўстановы адукацыі, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі і вышэйшай адукацыі;

фарміраванне і развіццё асобы вучняў, развіццё здольнасцей і схільнасцей, фарміраванне навуковага погляду, авалоданне спецыяльнымі, культурнымі, маральнымі нормамі і правіламі;

фарміраванне на аснове раскрыцця і рэалізацыі магчымасцей вучняў адукаванай, высокамаральнай, усебакова развітай асобы, гатовай актыўна дзейнічаць як раўнапраўны член грамадства;

спрыянне задавальненню нацыянальна-культурных запытаў вучняў, развіццю іх здольнасцей і інтарэсаў, фарміраванню гатоўнасці да самастойнага жыцця, свядомай адказнасці за свае ўчынкі і паводзіны.

2.4. У правядзенні адукацыйнай работы, замацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы Установа ўзаемадзейнічае з пазашкольнымі ўстановамі, працоўнымі калектывамі, прадпрыемствамі, арганізацыямі, кааператыўнымі, акцыянернымі аб’яднаннямі, з установамі адукацыі, аховы здароўя, культуры, спорта, добраахвотнымі аб’яднаннямі, сродкамі інфармацыі.

## Раздзел III
## ЗВЕСТКІ АБ ЗАСНАВАЛЬНІКУ

3.1. Заснавальнікам Установы з’яўляецца Нараўлянскі раённы выканаўчы камітэт (далей – Заснавальнік). Маёмасць належыць на праве камунальнай уласнасці Нараўлянскаму раёну, распараджэнне маёмасцю якога ажыццяўляецца Нараўлянскім раённым Саветам дэпутатаў (далей – Уласнік).

3.2. Органам дзяржаўнага кіравання, упаўнаважаным уласнікам кіраваць маемасцю Установы з’яўляецца аддзел адукацыі, спорту і турызму Нараўлянскага раеннага выканаўчага камітэта (далей – Упаўнаважаны орган).

3.3. Да выключнай кампетэнцыі Заснавальніка адносяцца:

зацвярджэнне Статута, змяненняў і дапаўненняў у ім;

вызначэнне прадмета, мэт і задач дзейнасці;

прыняцце рашэння аб рэарганізацыі і ліквідацыі Установы;

ажыццяўленне кантролю за выкарыстаннем па назначэнню і захаванню замацаванай за Установай маёмасці на аснове дэлігіраваных заснавальнікам правоў;

Заснавальнік рэалізуе іншыя правы і абавязкі, устаноўленыя заканадаўствам і гэтым Статутам.

3.4. У кампетэнцыю Упаўнаважанага органа ўваходзяць: ажыццяўленне каардынацыі дзейнасці Установы і кантроль за яе функцыяваннем.

## Раздзел IV
## КРЫНІЦЫ ФІНАНСАВАННЯ І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ МАЁМАСЦІ УСТАНОВЫ

4.1. Маемасць Установы знаходзіцца ва ўласнасці заснавальніка і знаходзіцца ў яе аператыўным кіраванні, у адносінах замацаванай за ёй маемасці здзяйсняе ў межах, устаноўленых заканадаўствам,

у адпаведнасці з мэтай сваей дзейнасці і прызначэннем маемасці права валодання, карыстання і распараджэння ёю.

4.2. Маемасць Установы складаюць асноўныя фонды і абаротныя сродкі, а таксама іншыя матэрыяльныя каштоўнасці, вартасць якіх адбіваецца ў самастойным балансе.

4.3. У выпадку ажыццяўлення Установай адукацыі дзейнасці, якая прыносіць даходы, атрыманыя ад такой дзейнасці даходы і набытая за кошт іх маёмасць паступаюць у самастойнае распараджэнне Установы адукацыі і ўлічваюцца на асобным балансе, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

4.4. Установа не мае права без узгоды Уласніка адчужаць або іншым спосабам распараджацца замацаванай за ей маемасцю і маемасцю, набытай за кошт сродкаў, выдзяленых ей па каштарысу.

4.5. Крыніцамі фарміравання маёмасці Установы з’яўляюцца:

маёмасць, перададзеная Установе заснавальнікам;

даходы, атрыманыя ад рэалізацыі прадукцыі, выканання работ і аказання паслуг;

дабрачынныя ахвяраванні юрыдычных і фізічных асоб;

іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

4.6. Фінансаванне Установы здзяйсняецца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту на аснове дзяржаўных і мясцовых нарматываў фінансавання, вызначаемых ў разліку на аднаго вучня для дадзенага тыпу і віду ўстановы адукацыі.

Прыцягненне Установай дадатковых сродкаў не цягне за сабой зніжэння нарматываў і памераў яе фінансавання з бюджэта.

4.7. Установа здзяйсняе платную адукацыйную дзейнасць па аказанню дадатковых адукацыйных паслуг, не фінансуемых з бюджэта.

Вартасць дадатковых адукацыйных паслуг вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам з улікам эканамічна абгрунтаваных затрат і зацвярджаецца дырэктарам установы.

4.8. Грашовыя сродкі, атрыманыя ў выніку здзяйснення гаспадарчай дзейнасці, у тым ліку аказанне платных паслуг, паступаюць у самастойнае распараджэнне Установы, улічваюцца і расходуюцца у адпаведнасці з заканадаўствам.

4.9. Матэрыяльна-тэхнічная база ўстановы фарміруецца па дзейнічаючых нарматывах з улікам забеспячэння атрымання агульнай сярэдняй адукацыі, тыпу ўстановы адукацыі і форм навучання.

4.10. Умацаванне, абнаўленне і развіцце матэрыяльна-тэхнічнай базы Установы здзяйсняецца за кошт бюджэтных сродкаў, атрыманых у выніку аказання платных паслуг, рэалізацыі прадукцыі і паслуг насельніцтву, дабрачынных ахвяраванняў арганізацый, юрыдычных

і фізічных асоб, іншых відаў дзейнасці, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

4.11. Фінансаванне і бухгалтарскае забеспячэнне дзейнасці Установы ажыццяўляе дзяржаўная установа «Цэнтр па забяспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый Нараўлянскага раёна» на аснове грамадзянска-прававога дагавора.

## Раздзел V
## ПАРАДАК КІРАВАННЯ ДЗЕЙНАСЦЮ УСТАНОВЫ, СТРУКТУРА І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ ОРГАНАЎ КІРАВАННЯ І САМАКІРАВАННЯ

5.1. Кіраванне Установай здзяйсняецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, гэтым Статутам і будуецца на прынцыпах адзінаначалля і самакіравання.

5.2. Установу ўзначальвае дырэктар, які назначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады Упаўнаважаным органам па ўзгадненню з Заснавальнікам.

Дырэктар здзяйсняе непасрэднае кіраванне адукацыйным працэсам і бягучай дзейнасцю, а таксама мае намесніка па асноўнай дзейнасці.

5.3. Дырэктар нясе адказнасць за якасць і эфектыўнасць работы, умовы працы работнікаў, ахову правоў, жыцця і здароўя дзяцей, прадстаўляе без даверанасці інтарэсы Вербавіцкай базавай школы ў дзяржаўных органах і арганізацыях, у судзе.

5.4. Дырэктар:

здзяйсняе кантроль за ходам і вынікамі адукацыйнага працэсу, праводзіць тэматычныя і выніковыя кантрольныя работы;

прымае на працу і звальняе ва ўстаноўленым парадку работнікаў;

размяркоўвае і нясе адказнасць за ўстанаўленне нагрузкі педагагічным работнікам;

набывае, арандуе, заказвае абсталяванне і іншыя матэрыяльныя рэсурсы ў юрыдычных і фізічных асоб па безнаяўнаму і наяўнаму разліку;

выдае даверанасці;

заключае дагаворы з арганізацыямі і фізічнымі асобамі, у тым ліку з вучнямі, на выкананне розных відаў работ па бягучаму рамонту, афармленню і гаспадарчаму ўтрыманню яе памяшканняў і збудаванняў;

заключае дагаворы на аказанне паслуг вучням, выхаванцам і іх законным прадстаўнікам, грамадзянам, а таксама арганізацыям;

выдае загады, распараджэнні і дае ўказанні, абавязковыя для выканання ўсімі работнікамі ўстановы.

5.5. Аплата працы дырэктара, у тым ліку яго заахвочванне за вынікі работы, здзяйсняецца ў парадку, вызначаным заканадаўствам.

5.6. Службовыя абавязкі дырэктара зацвярджае Упаўнаважаны орган.

5.7. Асноўным органам самакіравання Установы з’яўляецца педагагічны савет. Педагагічны савет узначальвае дырэктар.

5.8. Дзейнасць педагагічнага савета ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным Міністэрствам адукацыі.

5.9. Апякунскі савет з'яўляецца органам самакіравання Установы і ствараецца з мэтай аказання садзейнічання ў забеспячэнні яго дзейнасці і развіцця.

5.11. Ва Установе не дапускаецца стварэнне і дзейнасць палітычных партый і іншых грамадскіх аб’яднанняў, праследуючых палітычныя мэты.

5.12. Кантроль за дзейнасцю Установы здзяйсняе Упаўнаважаны орган, у падпарадкаванні якога ен знаходзіцца.

## Раздзел VI
## УЛІК, СПРАВАЗДАЧНАСЦЬ І ПАРАДАК КАНТРОЛЮ ЗА ДЗЕЙНАСЦЮ УСТАНОВЫ

6.1. Пісьмовая справаздачнасць вышэйстаячым органам прадастаўляецца Установай ва ўстаноўленыя тэрміны ў адпаведнасці з патрабаваннямі органаў дзяржаўнай статыстыкі Рэспублікі Беларусь. А таксама аператыўную інфармацыю аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці Заснавальніку.

6.2. Бухгалатарская справаздачнасць, як сукупнасць паказчыкаў, заснаваных на дадзеных бухгалтарскага ўліку, прадастаўляецца Установай адукацыі дзяржаўным органам, упаўнаважаным кіраваць дзяржаўнай маемасцю, на якіх заканадаўствам ускладзена права здзяйсняць праверку дзейнасці Установы.

6.3. Установа ажыццяўляе комплексны аналіз адукацыйнай дзейнасці, які ўключае самаправерку, самаацэнку адукацыйнай дзейнасці (самакантроль за забеспячэннем якасці адукацыі). Парадак і перыядычнасць правядзення самакантролю за забеспячэннем якасці адукацыі вызначаюцца кіраўніком Установы.

6.4. За непрадстаўленне і (або) скажэнне справаздачнасці, парушэнне тэрмінаў яе прадстаўлення службовыя асобы Установы нясуць устаноўленую заканадаўствам адказнасць.

## Раздзел VII
## ПАРАДАК ФАРМІРОВАННЯ ШТАТНАГА РАСКЛАДУ УСТАНОВЫ

7.1. Працоўныя адносіны работнікаў Установы рэгулююцца працоўным дагаворам (кантрактам), якія заключаны ў адпаведнасці з працоўным заканадаўствам, калектыўным дагаворам, Правіламі ўнутранага працоўнага распарадку.

7.2. Работнікі Установы маюць права на ўдзел у кіраванні ўстановай, на абарону прафесійнай і асобаснай годнасці і гонару.

7.3. Штатны расклад установы зацвярджаецца дырэктарам на аснове тыпавых штатных нарматываў, зацвярджаемых Міністэрствам адукацыі, у межах сродкаў, якія выдзяляюцца на аплату працы.

7.4. На педагагічную работу прымаюцца асобы, якія маюць неабходную прафесіянальную адукацыю або спецыяльную адукацыю пры ўмове праходжання імі інтэграваных курсаў псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі, з прадастаўленнем адпаведных падцвярджаючых дакументаў.

Кваліфікацыйныя патрабаванні да педагагічных работнікаў вызначаюцца адпаведнымі кваліфікацыйнымі характарыстыкамі.

7.5. Да педагагічнай дзейнасці не дапускаюцца асобы, якім занятак дадзеным відам дзейнасці забаронены рашэннем суда або па медыцынскіх паказчыках, а таксама асобы, якія былі асуджаны за вызначаныя злачынствы. Пералік адпаведных медыцынскіх супрацьпаказанняў і састаў злачынстваў вызначаецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

7.6. Аплата працы работнікаў Установы здзяйсняецца ў адпаведнасці з дзейнічаючым заканадаўствам, дзейнічаючымі ва Установе палажэннямі аб прэміраванні, аб надбаўках і даплатах.

7.7. Атэстацыя педагагічных работнікаў Установы здзяйсняецца ў парадку, вызначаным Міністэрствам адукацыі.

## Раздзел VIII
## ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

8.1. Установа забяспечвае атрыманне дашкольнай і агульнай базавай адукацыі.

8.2. Удзельнікамі адукацыйнага працэсу з'яўляюцца навучэнцы, законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў, педагагічныя работнікі.

8.3. Арганізацыя адукацыйнага працэсу ва Установе ажыццяўляецца ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі, а таксама тыпавым вучэбным планам і вучэбнымі праграмамі, распрацаванымі і зацверджанымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Штогод на аснове тыпавога вучэбнага плана, зацверджанага Міністэрствам адукацыі, Установа распрацоўвае ўласны план, які зацвярджаецца дырэктарам па ўзгадненні з Упаўнаважаным органам.

8.4. Навучанне ва Установе ажыццяўляецца на беларускай мове. Вывучэнне беларускай, рускай і адной замежнай мовы (англійскай або нямецкай) з'яўляецца абавязковым, за выключэннем асобных катэгорый дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

8.5. Ва Установе мовамі справаводства і дакументацыі, а таксама мовамі ўзаемаадносін з дзяржаўнымі органамі, органамі мясцовага кіравання і самакіравання з'яўляюцца беларуская і руская мовы.

8.6. Ва Установе рэалізуецца агульнаадукацыйная праграма дашкольнай адукацыі для выхаванцаў дашкольнага ўзросту, ажыцяўляецца навучанне і выхаванне на І і ІІ ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, рэалізуецца праграмма выхавання і абарона правоў і законных інтарэсаў дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Агульная сярэдняя адукацыя ва Установе складаецца з двух ступеняў:

І ступень – пачатковая адукацыя (І - IV класы);

ІІ ступень – базавая адукацыя (V – IX класы).

Засваенне зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі з'яўляецца абавязковым.

8.7. Тэрмін атрымання агульнай базавай адукацыі складае дзевяць гадоў.

Тэрмін навучання на ступенях агульнай сярэдняй адукацыі складае:

на І ступені – чатыры гады;

на ІІ ступені – пяць гадоў.

8.8. Пачатак і заканчэнне вучэбнага года, канікулярны час вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

8.9. Адукацыйны працэс пры навучанні і выхаванні на І, ІІ ступенях агульнай сярэдняй адукацыі арганізуецца ў рэжыме шасцідзеннага школьнага тыдня, які ўключае пяцідзенны вучэбны тыдзень і адзін дзень тыдня для правядзення з вучнямі спартыўна-масавых, фізкультурна-аздараўленчых, ці іншых выхаваўчых мерапрыемстваў, арганізацыі працоўнага навучання.

8.10. Асноўнымі формамі арганізацыі адукацыйнага працэса дашкольнай адукацыі з’яўляюцца гульня, занятак.

8.11. Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэса пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі з’яўляецца вучэбны занятак: урок, назіранне, экскурсія і іншы занятак. Вучэбныя заняткі могуць праводзіцца па зменах. Дадаткова праводзяцца факультатыўныя, стымулюючыя, падтрымліваючыя заняткі, грамадска карысная праца.

8.12. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца ў класах, у тым ліку класах інтэграванага навучання і выхавання.

8.13. Формы атрымання адукацыі ва Установе школе: навучанне хворых дзяцей, дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і дзяцей-інвалідаў можа ажыцяўляцца на даму па індывідуальных вучэбных планах.

8.14. Дазваляецца таксама па заявах законных прадстаўнікоў вучняў і са згоды Упаўнаважанага органа прадстаўленне вучням магчымасці атрымання пачатковай, базавай адукацыі ў сям’і. Рашэнне аб навучанні ў сям’і прымаецца педагагічным саветам установы, зацвярджаецца загадам дырэктара і ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым адпаведнымі нарматыўнымі актамі. Навучанне на даму можа быць адменена рашэннем педагагічнага савета па заяве законных прадстаўнікоў вучня, улічваючы вынікі атэстацыі, у выпадках, калі вучань да паступлення ва Установу або ў час навучання ў ёй самастойна засвоіў матэрыял, прадугледжаны адпаведнымі нормамі, педагагічны савет можа разгледзець пытанне аб залічэнні або пераводзе вучняў ў адпаведны клас.

8.15. Атрыманне агульнай пачатковай, базавай адукацыі суправаджаецца цякучай, прамежкавай і завяршаецца выніковай атэстацыяй па прадметах.

Атэстацыя, перавод, арганізацыя выпускных экзаменаў і выпуск вучняў ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Вучням, паспяхова завяршыўшым агульную базавую адукацыю, выдаецца пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі (пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай).

8.16. Прыем асобы для атрымання дашкольнай, базавай адукацыі ажыццяўляецца ў парадку вызначаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## Раздзел IX
## ПАРАДАК РЭАРГАНІЗАЦЫІ І ЛІКВІДАЦЫІ УСТАНОВЫ

9.1. Рэарганізацыя і ліквідацыя Установы, праходжанне атэстацыі і дзяржаўнай акрэдытацыі, здзяйсняецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

9.2. Рэарганізацыя або ліквідацыя Установы здзяйсняецца, як правіла, па заканчэнні вучэбнага года. Заснавальнік забяспечвае перавод вучняў у іншыя ўстановы па ўзгадненні з іх законнымі прадстаўнікамі.

9.3. Змяненні і дапаўненні ў Статут установы ўносяцца пасля іх зацвярджэння заснавальнікам у парадку, устаноўленным заканадаўствам.

Установа лічыцца ліквідаванай з даты прыняцця рэгіструючым органам рашэння аб унясенні запісу ў Адзіны джяржаўны рэгіст юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў аб выключэнні яго з гэтага рэгістра.